**Рынкевіч, К.** Успаміны часу непадуладныя / К. Рынкевіч // Міёрскій навіны. – 2024. – 30 студз. – С. 4.

## УСПАМІНЫ ЧАСУ НЕПАДУЛАДНЫЯ

**Ёсць падзеі, успаміны пра якія застаюцца яскравымі карцінамі ў памяці, колькі б часу ні мінула. Воін-інтэрнацыяналіст Міхаіл Кабёлка заўважае, што праз дзесяцігоддзі яго служба ў Афганістане прыгадваецца да драбніц. Халодныя ночы і густыя туманы, дзённая спякота з надакучлівым пылам, усмешкі таварышаў і свіст куль.**




– Нам так казалі: чуеш свіст куль – радуйся і пахлопай у далоні. Значыць, жывы, у цябе не трапіла. Калі б трапіла, не пачуў бы, – расказвае воін-інтэрнацыяналіст. – Афіцэры паўтаралі, што наша галоўная задача – выжыць і вярнуцца дадому. Там хутка жыццю навучылі. Усё па-сапраўднаму. Хапала і добрага, і дрэннага. Добрае хочацца памятаць, на дрэннае забыцца. Аднак у памяці застаецца ўсё, колькі б ні прайшло часу.

### Каманда 20а

На тэрміновую службу **Міхаіл Кабёлка** прызываўся вясной 1987 года. Датэрмінова абараніў дыплом у вучылішчы, дзе атрымаў прафесію токара.

Каманда 20а. Гэтыя словы супрацоўніка абласнога ваенкамата юнаку ні пра што не сказалі. Пасля прызыўнікам патлумачылі, што будуць праходзіць службу ў Афганістане, і заўважылі, што можна адмовіцца.

– У мяне такога і ў думках не было. Куды накіроўваюць – туды накіроўваюць, – акрэслівае сваю тагачасную пазіцыю Міхаіл Фёдаравіч. – Ды гэта і не палохала.

Перш чым трапіць у Афганістан, навабранцаў чакала літоўская вучэбка ў Гайжунаі. Міхаіл прасіўся ў асобны разведвальны ўзвод, аднак яму адмовілі.

– Прычыну не патлумачылі, – гаворыць ён. – Азнаёміліся з асабістай справай. У 1986 годзе не стала маёй маці. Дома засталіся бацька і тры сястры. Відаць, камандаванне вырашыла, што з разведкі магу дадому не вярнуцца. У выніку я стаў аператарам-наводчыкам БМП-2.

У пачатку лістапада Міхаіл Кабёлка ўжо быў у Афганістане. Месца службы – 32-я вартаўнічая застава непадалёк ад Кабула на вышыні крыху больш за два кіламетры.

– У Літве ўжо марозік, мы ў шынелях прыехалі – а тут спякота. Аднак уначы халодна, – прыгадвае суразмоўнік. – Жылі ў палатках, ежу самі для сябе гатавалі. Разам з афіцэрам нас на кропцы адзінаццаць чалавек было. З афіцэрамі пашанцавала – сапраўдныя мужыкі. За такіх – куды хочаш.

**На заставе і ў засадах**



Распарадак дня на заставе, са слоў Міхаіла Фёдаравіча, ад звычайнага армейскага не адрозніваўся. У шэсць раніцы пад'ём, у сем – сняданак, затым заняткі. Салдаты абавязаны былі сачыць за знешнім выглядам: падшывацца, чысціць абутак. Ад пастаяннага пылу і падкаўнерыкі, і боты хутка страчвалі належны выгляд.

Знаходзіўся час для забаў. Палявалі на курапатак, ладзілі жартоўныя спаборніцтвы, напрыклад, па паяданні хлеба на хуткасць.

– Першыя паўгода правялі на заставе. Пасля нас пачалі накіроўваць на баявыя заданні. Адказвалі за ахову калон нашых войск. Размяшчаліся ў тых месцах, дзе была верагоднасць абстрэлу. Часам тыдзень у засадзе маглі правесці, – прыгадвае суразмоўнік. – У цэлым мая служба ў Афганістане спакойна праходзіла. Разам з тым разумелі, што небяспека побач. Бывае, едзеш праз Кабул на ахоўную кропку на супрацьлеглым баку і думаеш, каб з якога куста па табе не пальнулі. Пару разоў нашу заставу абстрэльвалі.

З сур'ёзнай небяспекай давялося сустрэцца незадоўга да канца службы. За бой на перавале Паймунар узнагароджаны медалём «За адвагу». Кулі свісцелі, міналі. Адна трапіла ў сябра, аднак раненне аказалася няцяжкім.

З Кабула Міхаіл Кабёлка выходзіў 6 лютага 1989 года.

**На фота і ў памяці**

Дома чакалі родныя. Бацьку і сёстрам давялося пахваляваца за сына і брата. Першыя паўгода ад яго не было ніякіх звестак.

– Не ведаў, што пісаць, вось і маўчаў, – тлумачыць Міхаіл Фёдаравіч. – Тата трывогу падняў. Звярнуўся ў ваенкамат, там паведамілі, што я служу ў Афганістане. Пасля начальнік штаба палка загадаў мне напісаць дадому. Тое першае пісьмо было кароткім. Заўважыў, што служба праходзіць нармальна, надвор'е добрае.

Вярнуўшыся ў родную Махіроўку, што ў Новапагосцкім сельсавеце, Міхаіл уладкаваўся токарам у мясцовы калгас. Пасля пераехаў з сям'ёй у Міёры і перайшоў на працу ў ДРБУ-203. І цяпер заняты тут электрагазазваршчыкам.

Штогод 15 лютага прыходзіць на мітынгі на плошчу Памяці загінулых барацьбітоў у райцэнтры. Разам з іншымі воінамі-інтэрнацыяналістамі аб'язджае магілы салдат з Міёршчыны, якія не вярнуліся з Афганістана. Наведвае пахаванні і тых, каго не стала ў мірны час.

Памятае кожнага свайго саслужыўца, пераглядае чорна-белыя здымкі 35-37-гадовай даўнасці. На адным фота малады навабранец падчас прысягі, на другім – ужо на заставе разам з сябрам на баявой машыне, на трэцім – будні́чны афганскі пейзаж, на чацвёртым – мост праз раку Амудар'я, па якім калоны савецкіх войск выходзілі з Афганістана…

– Сумую па сваіх сябрах-саслужыўцах і ніколі пра іх не забуду, – заўважае Міхаіл Фёдаравіч. – Часта ўспамінаю той час, не толькі ў лютаўскія дні. Гэта назаўсёды.

**Кацярына РЫНКЕВІЧ.**

*Фотаматэрыял аўтара і з архіва Міхаіла КАБЁЛКІ.*

https://mijory.by